Дасылаецца дармова.

Пролетары усіх. краёў злучайцеся!

СЬВІТАНЬНЕ

№ 2.

...томесячны літарат.-мастацкі дадатак да „Нашага Працаўніка“

...926 | СЬНЕЖАНЬ | 1926

Падабед Язэп

Да трохгадовага юбілею „МАЛАДНЯКА“.

„Заіскрыла сонца-вір агнію... Буралом спаліла з гольлямі! Зьнікл хмары і...пад чырвоньню усе прасторы сталі голымі.
А сягоньня—чутны водгукі:—Нам расьці, дык мала дня!—Толькі тут узьнецца мог такі волат лес—Наш Маладняк“.

Міх. Чарот.

„... Знаем—намі пройдзеных пуцін не забыць, ня зьнішчыць, не закрэсьліць. Ня спыняцца, а далей ісьці—да жыцьця, да радасьці і песьні“.

Ал. Дудар.

Маладняк—гэта строма з бурных, вірлівых крыніц Вялікага Кастрычніка.

...ялікі Кастрычнік 1917 году зрабіў ...кі сацыяльны пералом у царскай ...і—ён яе ператварыў у вольную ...ну Саветаў, у вольны саюз раней ...ушаных і загнаных нацыяў. Стары ...кі уклад і законы паляцелі стар... спапялелі ў агні сацыяльнай рэ...цыі.

...наша Беларусь з часткі „Запад... края единой, неделимой Росии“ ... самастойнай рэспублікай саветаў. ...ты вялікі пералом ня мог не ...ць належных зьмен у нашай літа...ры. Літаратура — гэта люстэрка ...ця. А раз так, значыць,—працэс ...алай сацыяльнай ломкі, працэс ...а, сацыялістычнага, будаўніцтва ...ны былі знайсьці свой адбітак і ў ...атуры, дакладнай кажучы—павінны былі стварыць новы этап у літаратуры.

І яны яго стварылі.

Дарэвалюцыйная беларуская літаратура была ў свой час рэвалюцыйнай, але зараз яна не змагла здаволіць новых запатрабаваньняў. Патрэбна была літаратура з глыбокім пралетарскім зьместам.

Апрача таго, нашы старыя пісьменьнікі былі асьлеплены, зьбіты з панталыгу такім пераломам і не маглі адразу адшукаць правільнай дарогі.

Вось у такі востры момант у нашай беларускай літаратуры, рабочыя і сяляне вылучылі з сваіх гушчаў новых поэтаў і пісьменьнікаў, якія на грунце ідэолёгіі камуністычнай партыі аб'ядналіся ў арганізацыю «Маладняк».

Маладнякоўцы адразу рашуча і упэўнена сказалі, што яны, будучы кроўнымі сынамі рабочых і шырокіх працоўных сялянскіх масаў, прышлі каб ідэі Марксызму-Ленінізму праз мастацкія творы паглыбляць у масы.

І яны на працягу трох гадоў сваёй дзейнасьці цьвёрда выконвалі сваё абяцаньне.

Рост „Маладняка". Першы крызіс. Выхад групы таварышоў, як паказальнік ідэёвага росту арганізацыі.

«Маладняк» быў выклікан самім жыцьцём і гэта забясьпечвала і забясьпечвае яму далейшы росквіт.

Калі 28 лістапада 1923 году група таварышоў (Чарот, Александровіч, Дудар, Пушча, Бабарэка, Вольны) у ліку 6 асоб распачала працу па арганізацыі аб'яднаньня, дык на лістапад 1925 году (к часу І зьезду «Маладняка») у «Маладняку» ўжо было каля 200 сяброў і да 300 студыйцаў.

Гэта вельмі ярка паказвае да чаго вялікаю і моцнаю была цяга маладых сіл з рабочых і сялян да «Маладняка».

Да красавіка 1925 году існавала **група «Маладняк».** У красавіку-ж на 1-м пленуме «Маладняк», дзе былі прыехаўшы прадстаўнікі філіяў большасьці акруг (Калінінскай тады яшчэ ня існавала), было ухвалена пераназвацца ва **Усебеларускае Аб'яднаньне паэтаў і пісьменьнікаў.** На гэтымжа пленуме ухвалілі ў бліжэйшы час склікаць зьезд «Маладняка».

Побач з арганізацыяй філіяў, наладжваньнем вечароў «Маладняка», дыспутаў, агітацыйных выступленьняў—вялася выдавецкая праца. Творчасьць маладнякоўцаў рэалізавалася праз Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва, і праз уласнае выданьне (кніжніца «Маладняк»)

У лістападзе 1925 г. быў склікан І зьезд «Маладняка», які раней праведзеную працу і гэты кароткі час існаваньня арганізацыі назваў пэрыядам арганізацыйнага афармленьня «Маладняк». За гэты час ён «палітычна» заваяваў пануючую роль у беларускай літаратуры, умацаваўшы ў ёй свае рэвалюцыйна-наватарскія ідэі і выпрацаваў мэтады шырокай літаратурна-грамадзкай працы.

Пасьля зьезду ў гісторыі «Маладняка» пачаўся новы пэрыяд разьвіцьця. «Разьвіцьцё і пашырэньне сацыялістычнага будаўніцтва БССР, шырокае сталае разгортваньне будаўніцтва беларускае культуры пад кіраўніцтвам пралетарыяту і камуністычнай партыі, а таксама зьвязаная з агульным эканамічным і палітычным разьвіцьцём ўнутраная эвалюцыя ў шэрагах «Маладняка» —усё гэта прывяло яго да патрэбнасьці некаторай зьмены, паглыбленьня, удасканаленьня мэтадаў працы, увяло яго ў другі пэрыяд існаваньня...»

Патрэбна было адракціся ад безперабойных, неадкланных агітацыйных выступленьняў, ад выпуску ў сьвет «бурапеннай» літаратуры. Патрэбна было перайсьці ад «непасрэднае барацьбы» да «мірнага будаўніцтва», як гэта зазначыла ЦБ «Маладняка» ў Савецкай Беларусі ад 28|XI—1926 г.

Вось тут і пачаўся першы зацяжны крызіс у шэрагах «Маладняка», які вылiўся ў выхад групы таварышоў з арганізацыі. У чым былі разыходзіны?

Таварышы трымаюцца думкі, што задача сучаснае літаратуры «выхаваньне новага чалавека—грамадзяніна, чалавека сацыялістычнай грамады». Гэта значыць, што таварышы адмаўляюцца адгукавацца сваімі творамі на падзеі сёняшніх дзён, што таварышы ня вераць у стварэньне пралетарскай культуры **пэрыяду дыктатуры пралетарыяту,** а імкнуцца тварыць бязклясавую культуру.

Трымаючыся такой думкі, таварышы робяць і арганізацыйныя памылкі. Яны заяўляюць, што „не патрэбна філіяў і гурткоў, трэба каб 8—10 таленавітых асоб заняліся літаратурнай акадэмічнай працай і тварылі". Як бачым, таварышы хочуць утварыць „майстэрню літтвораў", узяць манаполію на літаратуру.

Няверые ў пабудову культуры пэрыяду дыктатуры пралетарыяту, няверые ў магчымасьць і неабходнасьць

весьці шырокую літаратурна-грамадзкую працу—паказвае, што таварышы збаяліся цяжкасьцей, адступілі перад цяжкасьцямі.

Клясавае расслаеньне ў горадзе і і вёсцы паставілі перад „Маладняком“ магчымасьць дыфэрэнцыяцыі (надзелу на часткі). Выхад групы таварышоў і ёсьць водгук гэтага працэсу.

Як мы павінны разглядваць гэты выхад?

„Маладняк“ пазбавіўся часткі хворых, ня зусім здаровых ідэолёгічных элемэнтаў і гэты выхад групы таварышоў мы будзем ацэньваць, як ідэолёгічнае аздараўленьне арганізацыі.

Неабходна ўдасканальваньне мэтадаў працы „Маладняка“.

Ад шырокае літаратурна-грамадзкае працы „Маладняк“ адракціся ня можа, бо гэта адзін з спосабаў утрымацца на правільных ідэёвых пазыцыях. Неабходнасьць яе адзначыў і сакратар ЦК КП(б)Б, тав. Крыніцкі, у сваём прывітаньні „Маладняку“ з прычыны юбілею.

Патрэбна будзе толькі ўнесьці нейкае разьмяжаваньне між літаратурна-грамадзкай працай і літаратурна-творчай.

Патрэбна будзе ўзмацніць паднясьце ўсебаковага культурнага ўзроўню маладнякоўцаў.

Патрэбна будзе змагацца за якасьць мастацкасьць творчасьці.

Патрэбна будзе арганізаваць сур'ёзную марксыцкую крытыку—вось канкрэтныя бліжэйшыя задачы „Маладняка“, якія вызначыла ЦБ. (Сав. Бел. ад 28/XI—1926 г.)

Менск. Ц. Б. „Маладняку“

Сход працоўных г. Клімавіч адзначаючы трохгадовы шлях літаратурнае творчасьці «Ммаладняка», шчыра вітае пралетарскіх пісьменьнікаў, дзяцей Кастрычніка і чакае яшчэ большай Вашай дзейнасьці на карысьць Савецкай Беларусі. ПРЭЗЫДЫУМ.

Калінінская філія „Маладняка“

„Маладняк“ у Калінінщчыну пранік толькі пасьля свайго 1 пленуму. Філія „Маладняка“ арганізавана ў сакавіку месяцы, а фактычнае існаваньне пачала са дню выхаду ў сьвет „Маладняка Калініншчыны“ (май, 1925 г.) З дапамогай гэтае лістоўкі (такім быў у пачатку „М. К.“) было ў каротскіх рысах азнаёмлена насельніцтва з „Маладняком“ і гэта прабудзіла маладыя творчыя сілы акругі, якія пацягнуліся да „Маладняка“. Выхад чарговых нумароў органу філіі і АК ЛКСМБ „Маладняк Калініншчыны“ павялічвае гэту цягу.

І Калінінская філія расьце. Калі ў пачатку было ў ёй 7 асоб, з каторых пісалі толькі 2 (аж сьмешна прызнацца), дык сёньня маецца кадр, творчае ядро, якое згрупавана вакол органу філіі. Хто чытаў апошнія два нумары „Маладняка Калініншчыны“ (№ № 3—4 і 5—6), дык той згадзіцца з тым, што многія з іх абяцаюць багатую будучыну.

Філія мае пры сабе два гурткі: Хоцімскі і Амсьціслаўскі.

Першы мае 5 сяброў гуртка, з іх частка—мастакі. Амсьціслаўскі мае 6 сяброў і абяцае далей шпарка расьці, чаму спрыяе тое, што гурток знаходзіцца пры пэдтэхнікуме.

Маецца на ўвазе арганізаваць гурток у Самацеевічах (Касьцюковіцкі раён.)

Сталых сяброў „Маладняка“ у Калінінскай філіі—2 За апошні час высунулася шмат студыйцаў, якіх патрэбна будзе ў бліжэйшы час перадаць у сапраўдныя сябры «Маладняка».

Кепска ў філіі пастаўлена літаратурна-грамадзкая праца і унутры—выхаваўчая. Адсутнасьць моцных тэарытычных сіл у самой філіі, слабая увага з боку ЦБ „Маладняка“, як на слабейшую з усіх іншых філіяў—усё гэта востра адбіваецца на працы і на росьце філіі.

З боку Акругкому КПБ і за апошні час ад Акругкому ЛКСМБ філія карыстаецца увагай і дапамогай у працы, З гэтага боку дырэктыва т. Крыніцкага на 1 зьезьдзе Маладняка, што усе пытаньні, патрабаваньні дапамогі і парадаў акруговым філіям „Маладняка“ павінны праз камсамол даходзіць да Акругкому КПБ—у Калінінскай філіі ажыцьцяўляецца досыць здавальняюча.

Глеба для росту ёсьць, спрыяючыя умовы ёсьць, патрэбна толькі большая увага (у сэнсе індывідуальнага падыходу) з боку ЦБ „Маладняка“ і большая напорнасьць у працы саміх Калінінскіх Маладнякоўцаў і філія ня будзе ў ліку другіх філіяў апошняй.

К. Кагановіч.

Зьм. Астапенка.

* * *

І дзень за ноччу, і ноч за днём
Чаргой бязконцаю праходзіць.
Зьвініць жыцьцё, бліщчыць агнём.
Імчыцца ў дзіўным карагодзе.

Пайду, пайду на шыр палян
Душой у прасторы акунуся,
Абніме ў сьцяж душа мая
Прасторы маці Беларусі.

Пайду на вёску, адгукнусь
Ёй песьняй гулкіх сутарэньняў,
Паклічу звонкую вясну
З вянкамі сонечных праменьняў.

І дзень за ноччу, і ноч за днём.
Чаргой бязконцаю праходзяць.
Сьпяваю песьні ў тахт з жыцьцём
У яго агністым карагодзе.

Янка Гемакаў.

ПЕСЬНЯ.

Ой, размахні, ты песьня, крыльлем
у палёх сталёвы звон рассып!...
Сягоньні далі заіскрыліс
у крышталях сонечнай расы...

І расквітнелі краскі волі.
І зашумелі ў тахт бары.
Што дні бурлівыя сваволяць,
Што новых дзён агонь гарыць...

З лістоў саян саткала восень
і палікоў узорных ніць.
Ой, то ня казкаю збылося
і ня мінорамі зьвініць.

Дык размахні ты песьня крыльлем
у палёх сталёвы звон рассып—
Ня дарма далі заіскрыліс
у крышталях сонечнай расы.

* * *

Ціха дрэвы шапочуць лістам.
Праменьні сонейка косіць.
І чаму-ж ды яшчэ ня сьцяміць.
Што прышла срэбралістая восень!

Ды й ці можна цяпер сумаваць,
Над прасторамі родных палёў.

Янка Панамароў.

Ну, дык што-ж калі жоўкне трава?
Асыпаецца лісьцем гальлё.

Лісьця з дрэваў зьляцець да вясны,
А з прыходам красуньні прыгожай.
Ажывецца ўсё пахам лясным:
Бо загінуць нічога ня можа...

Самае каштоўнае ў „Маладняку"—гэта тое, што „Маладняк" зьяўляецца шырокаю арганізацыяй, якая ўцягнула ў свае рады шмат рэвалюцыйных сіл рабочых і сялян, што ўся літаратурная і выхаваўчая праца «Маладняка» і маладнякоўцаў шчыльна ўвязваецца з палітычнаю працаю і барацьбою рабочае клясы і сялянства, камсамолу, камуністычнае партыі. Гэтыя два моманты зьяўляецца важнаю гарантыяй таго, што і далей „Маладняк" здолее выхоўваць сваіх сяброў у духу дыктатуры пралетарыяту і пралетарскае лініі ў літаратуры,—гарантыяй таго, што „Маладняк" на справе здолее ўсё больш рэалізаваць сваю волю і жаданьне—быць арганізацыяй пралетарскіх пісьменьнікаў, што ў гэтым напрамку „Маладняк" здолее з сялян і сялянскіх інтэлігэнтаў выпрацаваць паэтаў і літаратараў, якія дадуць селяніну літаратуру ў поўнай меры пралетарскую па зьместу.

А. Крыніцкі.

Думкі „Маладняка“ радзіліся раней, чым тры гады таму назад. Яны радзіліся тады, калі босыя змагаліся на вогнішчы, калі грымелі пяруны Кастрычнікавай Рэвалюцыі. „Маладняк“ ёсьць сын Кастрычнікавай Рэвалюцыі. Заданьне яго—тварыць элямэнты пралетарскай культуры. Лічу, што сваё заданьне ён выкапае.

У. Ігнатоўскі.

Я. Міхневіч.

* * *

Прыгледжуся да навакольля,
Імчыцца дзён вірлівых натаўп:
То сьцішыць бег, то зноў паболіць.
Ня будзе кволаму спагады,
На ўхабнай сьцежцы ногі зломіць!

Ня любіць сьцежка наша кволых,
Чыё ў палёце крыльле вяне!
Ня вучыць час схіляці голаў
К распранутаму ветрам долу,
Глытаць тугу песпадзявана!

Каса, саха, гумно і поле
Расьцілі нас і гартавалі,
Віхры-буруны далі волю
І песьню пець к сабе гукалі,
Калі гулялі навакольлем.

За урачыстасьцямі будні
Заніталаліс талакою...
Вятры ня бралі сілы дуба,—
Нас чад тугі ня ўпоіць!

Ю. Таўбін

Амсьціслаўская група „Маладняк“.

Сінія далі;
Сінія высі...
Мне спадабаліся
Говары лісьця.

У высі крышталяць
Зоранькі—вочы...
Мне спадабаліся
Зорныя ночы.

Шмат мне прарочаць,
Шмат чаго дараць
Цёмныя ночы,
Сьветлыя мары...

Хай адкрасуюць
Дрэваў карункі,
А ня згублю я,
Іх падарункаў.

Буду я помніць,
Што мне казалі
Вечарам цёмным
Сінія далі.

Сінія далі,
Сінія высі,
Зоры—крышталі,
Шорахі лісьця.

Янка Панамароў.

СТРУМЕНЬ ЖЫЦЬЦЯ.

Што у жыцьці лякоча адгалоскам,
Пераказаць, дык і ня хопіць слоў!
Новы гул і хваляў новы лёскат,
Нясе у даль і горад, і сяло.

. . . .

Плыве у хвалях будучыны новай,
Плыве і плёскае, і ломіць перагіб.
Паразламаў струмень жыцьця аковы,
Вякі вадою падмылі берагі.

Яго і ня стрымаць, хто цэлымі вякамі
Прастору не даваў і ціснуў жвір яго.
Дык ці стрымаць-жа берагавы камень,
Калі вада шуміць, бяжыць бягом?!

Ну, ці стрымаць-жа хвалі маладыя—
І той вялікі шлях таксама ці стрымаць?
Дык і навошта траціць словы тыя,
Калі упэўнен кожны, што дарма!...

Што у жыцьці лякоча адгалоскам,
Пераказаць, дык і ня хопіць слоў!
Новы гул і хваляў новы лёскат
Нясе у даль і горад, і сяло!...

20-х гадовы юбілей літаратурнай творчасьці Якуба Коласа.

Якуб Колас—народны паэт

Прызнаючы вялікае значэньне для працоўных-беларусаў: беларускай культуры, літаратурна-мастацкай дзейнасьці беларускага паэта Якуба Коласа, Савет Народных Камісараў Беларусі, у адзнаку 20-х гадовай літаратурнай працы паэта пастанавіў:

1. Даць званьне Якубу Коласу—Народнага Паэта.

2. Назначыць яму пажыцьцёвую пэнсію ў разьмеры стаўкі адказных палітычных работнікаў Беларусі.

Менск І. Б. К. Якубу Коласу.

Працоўныя г. Клімавіч, сабраўшыся на сход прысьведчаны юбілею Вашага 20-цёх гадовае літаратурнай дзейнасьці шчыра Вас вітаюць і жадаюць посьпеху ў далейшай вашай працы на карысьць рабочых і сялян.

ПРЭЗЫДЫУМ.

Якуб Калос (Канстантын Міцкевіч)

Якуб Колас (Канстантын Міцкевіч) нарадзіўся ў 1882 годзе ў сялянскай хаце, у засьценку Акінчыцы Менскага павету, Менскай губэрні. Сяляне вёскі Мікалаеўшчыны, адкуль быў родам яго бацька, часта пасылалі сваіх дзяцей адукавацца да Нясьвіскай настаўніцкай сэмінарыі. Так зрабілі й бацькі Якуба Коласа. Будучы ў сэмінарыі, пясьняр не прарываў зьвязку з тою глебаю, якая яго выгадавала. Скончыўшы сэмінарыю, Міцкевіч зрабіўся вясковым настаўнікам. Тут перад ім устала пытаньне, на якой мове трэба вучыць вясковых дзяцей. Адказ на гэтае пытаньне быў ясны: вясковых дзяцей трэба вучыць на іх роднай мове, на якой яны гавораць у сваёй хаце. Каб дабіцца гэтага, Якуб Колас залажыў хаўрус беларускіх настаўнікаў, за што і павінен быў потым заплаціць трама гадамі турмы. Пасьля турмы доўга прышлося песьняру шукаць сабе работы і толькі праз нейкі час дабіўся ён месца настаўніка.

Рана пачуў Якуб Колас у сабе пясьнярскі дар. З добраю песьняю, з прызывам да працы, з надзеяю на лепшую будучыню выступіў пясьняр на шлях жыцьця. Ён спадзяваўся разбудзіць братоў сваіх ад векавечнага сну. У 1906 годзе у беларускім часопісу «Наша Доля» быў надрукаваны яго першы верш—прызыў да сваіх братоў, да сваёй старонкі.

Зьм. Астапенко.

Ой рассыпся, песьня,
Звонкай златаструньню
Па зялёным гаі,
Па зялёнай руні!
Рассыпайся звонам,
Стройным сугалосьсем—
Як шуміць у полі
роднае калосьсе.
Цей, ты, як на лузе
чуць сялян размовы,
На начлезе казкі,
Ноччу ля дубравы.

Як па стрэхі вёсцы
ціха ноч зьлятае,
Песьня, мая радасьць,
Песьня залатая!
Як жытнёвым гмахам,
Дружнай грамадою
Раз па раз будуюць
жыцьцё маладое.
Як сьмяюцца новым
Яравыя далі—
што далі мне песьню,
Змалку ўзгадавалі.

Ю. Таўбін.

ГЭТА НАМ.

Нас мільлёны... Мы інакшай
Лепшай долі кавалі!
Нашу долю, наша шчасьце
Мы ў жыцьці сабе знашлі.

Хто сказаў што мы усталі,
Што няма ў нас гарту сіл?
Алым полымем запалім
Аксамітны небахіл.

Гэта нам шапоча казкі
Сінявокі небазвод.
Гэта нам ківаюць краскі
Русакудрай галавой.

Гэта нам сьмяюцца зоры
Нас вітае ясакар,—
Нам бруіцца у прасторы
Срэбралітная рака.

Гэта нашай юнай раці,
Поўнай пэнту і красы
Шлюць паклоны сенажаці
І зялёныя лясы.

Гэта нам сьпявае гымны
Буйны вецер трысьці
Мы, адважныя, ня згінем
Пераможам у жыцьці.

Мы ня згінем! Песьняй-лавай
Закрынічым у палёх
З намі сіла, з намі права
З намі наш бурлівы лёс.

Юлій Таўбін.

ЯКУБУ КОЛАСУ.

Сінім вечарам неба сіняе.
Неба сіняе, зорак рад...
Прывітаньне-ж табе арліна
Ад дзяцей тваіх арлянят!

Пачынаў ты ў восень шэрую
Пад насьмешкі, пад зьдзекі, глум,
А сягоньня ад нашых шэрагаў
Шлём вітаньне старому арлу.

Сёньня словы—у бунтарскай постаці,
Сёньня ў словах—агнём запал...
Сваёй песьняй шчырай і простаю
Ты ў юнацкае сэрца запаў.

Песьня, любая сэрцу юнацкаму,
Разьліваецца ў шэрагі хат...
Прывітаньне-ж табе маладняцкае
Ад дзяцей тваіх—арлянят!

Што і чаму не пашло да друку.

—СТРУЖЦЫ: Твой верш „Чырвоны Сьцяг" ня пойдзе ў друк. Багата русіцызмаў: „акцябр", „лікуем", „сплаціць" і г. д. Пры тым верш—голы крык:

„Дык хай-жа рэе сьцяг чырвоны!
Няхай крэпне камунізм!
Далоў паноў! Далоў тэроры!
Далоў банкіраў і фашызм!"

—Д. ЮДЗЯНКОВУ: „Чарговае" ваша ня будзе друкавацца. Вы пішаце:

„Зямля—сялянам, а рабочым
І фабрыкі і прамысловасьць.
Чарговае—няхай жыве
Савецкая, чырвоная законнасьць!

Па-першае—гэта зусім няправільна. Па-другое—ня вучыцеся ў Журбы ўжываць ня поэтычныя выразы. У таго у адным нумары „Полымя" было:

„...праца ў краёх пралетарскіх
маналітнасьцю—гартам сагрэта".

А ў вас—прамысловасьць, законнасьць.

—В. Е. РАДЧАНКУ: На гэты раз твае ўсе тры вершы да друку не падходзяць. Русіцызмы—„жызьнерадасны", „успряне", „успыхне".

Другое—думку, якую ты хочаш выказаць, да канца ты ня вытрымоўваеш, а зьбіваешся ў бок, альбо няправільна выказваеся. Ты крыўдзішся, калі цябе абвінілі ва ўхіле ў нездаровасьці. Што ты чытаеш народныя песьні, вывучаеш іх і карыстаеш—відочна. Але ты ня бярэш ад іх прыгожай формы, а і зьмест, напр.: індывідуалізм, лішнюю сумоту („Песьня") і г. д. Працуй, прысылай новыя рэчы, пабачым.

—КОЛЮ: Пішы, можа што й выйдзе. Гэтыя-ж вершы, што ты прыслаў, ня пойдуць. А вобразаў у вершах тваіх, як бульбы ў крупніку дзевятнаццатага году. У гэтым напрамку ў цябе вялікая хіба. З боку формы (тэхнікі вершу) таксама. А шчырасьць у цябе ёсьць.

—Я. ДЗЬМІТРАЧЭНКУ: Вершы да друку не падыходзяць. Пішыце лепш прозай. Шліфуйце сваю мову больш старанна і упарта.

—АГЕЯНКАВУ: „Ігрышча" ня пойдзе. Вы пішаце цалкам пад „Тарас на парнасе" і „Энэіда на выварат", толькі ў нашых савецкіх умовах.

Апісальныя здольнасьці у вас бязспрэчны, ёсьць трапныя вобразы, але ў цэлым рэч ня мае ніякай каштоўнасьці.

„Праздник девятилетия Октября" трохі лепш напісана, але па расейску.

„Роспуск з женой" і „Промчались годы"—таксама ня пойдуць. Кепска, што вы цалкам зьдзіраеце з Некрасава і з песьні „Последний нынешний денечек".

—Раману ЛЯШКО: Вашы вершы: „Нікуды не пайду“, „Цьвяты“, „Толькі цёмна стане“, „Смычка“ і асабовы ліст т. Юргялевічу рэдакцыя атрымала. Першае, што вам патрэбна сказаць шчыра і адкрыта: пакіньце пісаць вершы, паэта з вас ня будзе. Вы захварэлі на вершаманію і ў сьне вам здаецца, што вы маеце „прыродны дар літаратуры“.

Вы вучань школы сялянскай моладзі. Раім вам лепш напружна заняцца вучобай, працуйце над сабой, каб стаць добрым грамадзкім працаўнiком. Жадаем, каб вы як мага хутчэй пазбавіліся свайго пэсімізму, які засьляпіў вам вочы.

—П. ШЫНКАРОВУ: У вашых частушках „Пад трохрадку“ ёсьць досыць удалыя мясьціны, як напрыклад:

„А мой міленькі скасеў,
к другой барышні прысеў.
Я стаяла—думала,
завярнулась, плюнула.

—Але ёсьць і дужа наіўныя мясьціны, як напрыклад:

„Харашо ў лапцях хадзіць,
ды дрэнна абувацца,
харашо дзяўчат любіць—
дрэнна раставацца“.

Толькі вось што кепска: вы бярыце цалкам народныя частушкі і выдаеце за свае уласныя, як гэта вы зрабілі з вышэйнапісанай частушкай: „А мой міленькі скасеў“. Прысылайце народныя частушкі, рэдакцыя надрукуе, але-ж адзначайце—што гэта народнае, дзе вы чулі (у якой вёсцы) і г. д.

Здольнасьці у вас ёсьць. Пішаце досыць гладка і чыста, нават цікава. Працуйце, прысылайце новыя, будзем друкаваць.

—В. ДАБРАВОЛЬСКАМУ: „Другу—Кастрычніку“—ня пойдзе. Слабы верш—выкарыстаць нельга. Карэспандэнт вы добры, а як паэта—зусім слабы.

—М. АЎСЯНЬНІКАВУ: „Пагібшым барцам“—друкавацца ня будзе. Вы нешта хацелі напісаць на кшталт жалобнага маршу (нават рытм: „вы жэртваю палі), але ў вас нічога ня вышла. Пішыце на іншыя тэмы, можа выйдзе лепш.

—А. БАРЫСЁНКУ: Пашоў ты, браце, нешта „У брод“ і выходзе кепска. Вершы ў цябе ня ўдаюцца,—няма вобразаў, гэтай галоўнай адзнакі паэты. Прабуй пісаць прозай.

—М. ВОСТРАМУ: Вы таксама, як Ляшко, нешта прыхварнулі. Вы пішаце, напрыклад, як малацілі цэпам і вам балела сьпіна і між іншым адзначаеце:

„А яна ў мяне гнуцца ня гнулась,
Сагінацца—у пекла ісьці,
У ёй была вялікая чуласьць,
Якая бывае ва ўсіх.
Бывае ва ўсіх у маладосьці;
Кволая сьпіна калі,
Калі дзеці усе ягамосьці,
Нібы, як тыя паны.

Перачытайце яшчэ раз самі—гэта-ж поўная недарэчнасьць. У вершу „Песьня маладога хлапца“ вы пішаце:

...„Дабіваўся у бацькі грошай
Для каханай у шахты хацеў.
Усё для яе, для харошай
Над гэтаю душкай пацеў“.

З боку формы у вас адчуваюцца маленькія пробліскі здольнасьцей, але наконт зьместу—бяда!

Сьмешна становіцца, калі чытаеш, і разам балюча: вы піанэр і аддавацца такім рэчам вам рана, шкодна. Вы два гады ў атрадзе, а піанэрскага выхаваньня на вашых рэчах не адчуваецца Раім пакінуць пісаць вершы, а заняцца вучобай, працуйце ў атрадзе і камсамоле. Пакіньце чытаць старыя авантурыстычныя раманы, чытайце новую белетрыстыку.

—Зьмітр. АСТАПЕНКУ: Верш „На горадзе“—друкавацца ў „Сьвітаньні“ ня будзе. Чакаем новых твораў.

—Лявону АСТАПЕНКУ: Усе дасланыя вамі вершы—друкавацца ня будуць—рыфмаваная проза ня больш і загэтым друкаваць няма сэнсу.

—П. С.: Ты, дружа, агітуеш у 1926 г. за савецкую уладу ў краіне Саветаў. Так рабіць ня варта—безкарысна. Паэта з цябе ня будзе, пісаць вершы далей ня раім.

—Янку ГРУШКОВУ: Твае вершы: „Янку Купалу“, „Беларус“, „Даволі паспалі“, „Матарыст“, „Нёман“—ня пойдуць. Пішы, друкуй у насьценгазэце вашага дзетдому, а калі акрэпнеш, будзе выходзіць добра—прысылай у „Сьвітаньне“. Працуй больш над сабой, чытай старэйшых і маладзейшых бел. пісьменьнікаў.

—Н. ЧУБАКОВУ: Твае ніжэйпералічаныя творы друкавацца ня будуць:—Вершы: „Камсамолкі йшлі да дому“, „Гары“, „Дудар“, „На чужыне“, „Дні нашы новыя“, „Па-над вёскай“, „Камуністы“, „Сьмерць сялькора“, „Сыны камсамоліі“ і апавяданьні:—„Кірмаш у Хоцімску“, „Першамайскія дні“ і „Не дачакаліся вынікаў“.

Як ні жаль, а трэба сказаць, што ты мала працуеш над сабой у сэнсе паляпшэньня сваіх твораў, паляпшэньня іх якасьці. Проза ў цябе выходзе лепш чымся вершы. Папробуй упарта папрацаваць у гэтым напрамку. Чакаем новых рэчаў.

Пішы аб жыцьці і працы групы „Маладняка“.

—А. ЖОРАВУ, А. ВАЛІЙСКАМУ, А. ВЯСЁЛАМУ, Г. ТОЙЛЕВУ, А. РАЗАНЦАВУ, КАЧАНКОВУ: вашы вершы і частушкі ня пойдуць, слабыя.

—Янку ПАНАМАРОВУ: „Струмень жыцьця“ і „Ціха дрэвы шапочуць лістамі“ зьмяшчаем. Ніжэйпералічаныя вершы друкавацца ў „Сьвітаньні“ ня будуць: „Асеньняе“, „Там, дзе сіняй дымкай“, „Сёньня, сёньня ўзноў бадзёры“, „Вечарэла“. Прагляд гэтых вершаў дае уражаньне, што ты за апошні час вырас, як паэта. Неабходна зьвяртаць больш увагі на чыстату мовы. Дасылай новыя рэчы, выдрукуем.

—Ал. ДУДЗЕ: Пішы, як распачынае працу ваш гурток „Маладняка“, дасылай свае творы, будзем зьмяшчаць.

Карлі Кагановіч.